# § 2. ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МАСТАК?



**Пэр Барэль дэль Каса.**
Уцякаючы ад крытыкі

**А́ўтар** – стваральнік мастацкага твора.



**Валянцін Сяроў.**
Дзяўчынка з персікамі

Цяжка ўявіць чалавека, якога мастацтва пакідае безуважным. Самі таго не заўважаючы, мы дзелімся з сябрамі ўражаннямі ад прагледжанага фільма, пачутай музыкі, убачаных пабудоў.

А цяпер уявіце, што мастацтва знікла з нашага жыцця. Вядома, свет не спыніць свайго існавання. Застануцца сонца, неба, зоркі, цікавыя прафесіі. Застанецца сам чалавек. Аднак яго жыццё стане нашмат бяднейшым, таму што менавіта мастацтва ўзбагачае яго разнастайнымі фарбамі, напаўняе яркімі эмоцыямі і ўражаннямі.

Мастацтва — універсальная мова зносін. Яе разумеюць людзі розных узростаў, нацыянальнасцей, прафесій.

Кожны чалавек камунікуе з мастацтвам па-свойму. Хтосьці любуецца маляўнічымі палотнамі, хтосьці не разлучаецца з музыкай. А хтосьці, як хлапчук на карціне Пэ́ра Барэ́ля дэль Ка́са «Уцякаючы ад крытыкі», здольны ўявіць сябе ўнутры твора мастацтва.

Працэс стварэння мастацкага твора загадкавы і таямнічы. Ніхто не можа адказаць на пытанні, дзе мастак бярэ ідэі для твораў і як фантазія *аўтара* ператварае ідэю ў бачны ці чутны вобраз.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Азірніцеся навокал! Перад вамі — свет, напоўнены разнастайнымі пачуццямі, думкамі, ідэямі, падзеямі. Усё гэта можа стаць *тэмай* мастацкага твора.

Напрыклад, на карціне мастака Валянціна Сярова — звычайная дзяўчынка. Магчыма, яна падобная да каго-небудзь з вашых знаёмых? Цяпер паназіраем за дзяўчынай, якая сядзіць на гранітнай скале. Пра што яна так кранальна сумуе? Што асаблівага бачаць паэты і мастакі ў скульптуры «Малочніца», створанай рускім скульптарам Паўлам Сакаловым?



**Павел Сакалоў.**
Малочніца (Расія)

И ослепительно стройна,
Поджав незябнущие ноги,
На камне северном она
Сидит и смотрит на дороги...

*Ганна Ахматава*

**Тэ́ма маста́цтва** – з'явы або падзеі, на якія аўтар хоча звярнуць нашу ўвагу.



**Мікалай Рэрых.**
Сеча пры Керженцы (эскіз дэкарацыі да оперы «Паданне пра нябачны град Кіцеж і панну Фяўронію»)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

А ў музычным творы «Се́ча пры Ке́ржанцы» Мікалая Ры́мскага-Корсакава — эпізод гістарычнай бітвы. Калі быць уважлівым, то можна не толькі пачуць гукі бітвы, адчуць рытм коней, якія скачуць, але і ўявіць вобразы людзей, якія ваююць.

Свет мастацтва дзіўны. Ён нібы вытканы са шматлікіх тэм і сюжэтаў. Кожны новы твор мастацтва — новая сустрэча і новая загадка. Засталося толькі пастарацца разгадаць яе...

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У гэтым параграфе вы даведаліся, хто такі аўтар твора мастацтва. Пералічыце мастацкія творы (жывапісу, скульптуры, музыкі, архітэктуры), з якімі вы пазнаёміліся ў гэтым параграфе і электронным дадатку. Якія творы мастацтва створаны сучаснымі аўтарамі? Чаму вы так вырашылі?

2. Паслухайце сімфанічную карціну «Сеча пры Кержанцы» Мікалая Рымскага-Корсакава. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю работы Мікалая Рэ́рыха з аднайменнай назвай. Якія пачуцці ў вас выклікаюць абодва творы? Пра што расказваюць аўтар-жывапісец і аўтар-кампазітар? Якая тэма адлюстравана ў гэтых творах?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Раскажыце сваім сябрам пра мастацтва. Якія героі вам цікавыя? Над якой важнай праблемай вам хацелася б паразважаць? Якія віды мастацтва вы выбралі б для сваёй творчасці? Падзяліцеся сваімі ідэямі з аднакласнікамі. Давайце паспрабуем рэалізаваць вашы прапановы ў гэтым навучальным годзе!

## § 3. ІНСТРУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ МАСТАКА

***Як з'яўляецца твор мастацтва?*** Для таго каб наблізіцца да разгадкі таямніцы мастацкага твора, паспрабуем прыадкрыць заслону і паназіраць за працэсам яго стварэння. Зазірнём у мастацкую майстэрню. Што там нас чакае?

Спачатку мы ўбачым аўтара мастацкага твора. Незалежна ад таго, над чым працуе аўтар — над карцінай, скульптурай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне